# «Белыя ветразі»

Май 2021 № 39




*Гэты дзень не забыць пакаленням.*
*Самым светлым ён стаў на зямлі.*
*Хто хацеў бачыць свет на каленях,*
*Той сваё да зямлі прыхіліў.*
*І прыходзяць героі штогодна*
*На мясціны крывавых баёў,*
*Дзе калісьці зямлёю халоднай*
*Накрывалі навекі сяброў.*
*Хай красуюцца кветкі заўсёды*
*У падножжы свяшчэнных магіл,*
*Пакланяцца ім будуць народы.*
*Будзе чысты заўжды небасхіл.*
*Бо каб месца найменш было ружжам*
*І каб больш было ўсюды сяброў,*
*Тут героі ў яркія ружы*
*Улілі сваю яркую кроў.*
*Гэты дзень не забыць*
*пакаленням,*
*Самым светлым ён стаў на замля.*
*Хто хацеў бачыць свет на каленях,*
*Той сваё да зямлі прыхіліў.*

*Іван Стадольнік*

**Сёння ў нумары:**

**“Бясмертныя іх помнікі крані ты…”**

# Кожны чалавек павінен ганарыцца той мясцінай, дзе нарадзіўся...

У кожнага чалавека ёсць вельмі блізкае і роднае месца, дзе ён адчувае сябе спакойна, свой прыстанак, дзе можна на час спыніцца і адпачыць ад забот і праблем.

Малая радзіма – гэта месца, дзе чалавек нарадзіўся, вырас, вучыўся, дзе жывуць яго родныя і блізкія. Гэта тое месца, любоў да якога пасяляецца ў сэрцы назаўсёды. Але ўсведамленне сваёй радзімы, пачуцця любові да яе ўзнікае не адразу. Для дзіцяці ў маленстве важней за ўсё бацька і маці. Падрастаючы, яно пачынае адчуваць прывязанасць да сяброў, да роднай вуліцы, да рэчкі, да сваёй вёскі ці горада. І няважна, чым з’яўляецца твая радзіма: вялікім прамысловым горадам ці маленькай вёсачкай.

Радзіму не выбіраюць. Ты яе прымаеш такой, якая яна ёсць.

Кожны чалавек павінен ганарыцца той мясцінай, дзе нарадзіўся і жыве: павінен мець пачуццё нацыянальнай годнасці. А гонар, у сваю чаргу, мацнее ад назапашвання ведаў пра самыя цікавыя і адметныя звесткі з гісторыі роднага куточка: якой была мясцовасць у даўнейшыя часы, адкуль паходзіць назва, якія цікавыя людзі жылі і якімі сваімі справамі, здольнасцямі запомніліся ў народзе. І толькі так узнікае неабдымная любоў да Радзімы, вялікі гонар за яе дасягненні, імкненне зрабіць свой уклад у агульную справу.

У сённяшнім выпуску газеты мы раскажам пра гісторыю помнікаў нашага горада, што ўшаноўваюць памяць аб героях Вялікай Айчыннай вайны.

Ваўкавыск быў вызвалены 14 ліпеня 1944 года войскамі 3-й арміі 2-га Беларускага фронту ў выніку стратэгічнай наступальнай аперацыі “Баграціён”.

Сярод слаўных старонак, упісаных беларускім народам у нашу Вялікую Перамогу, самая значная па размаху, бяспрыкладная па мужнасці - трохгадовая партызанская барацьба з гітлераўскімі акупантамі. Барацьба, якая ва ўсім свеце выклікала павагу і за-хапленне гераічнай рэспублікай-партызанкай.

Шматлікія помнікі і мемарыялы землякам - удзельнікам вайны ўзведзены практычна ва ўсіх гарадах і пасёлках, шматлікіх вёсках нашай рэспублікі. На многіх з іх пераліча-ны прозвішчы загінуўшых, каля падножжа - Вечны агонь.

# “Бясмертныя іх помнікі крані ты…”

## Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан

Мемарыяльны комплекс вызваліцелям на вуліцы Жолудзева, у Скверы Памяці. У 1965 г. на ўшанаванне памяці воінаў і партызан на брацкай магіле ўстаноўлены помнік – скульптура воіна і дзве стэлы. У 1987 заснаваны мемарыяльны комплекс. На магілах Герояў Савецкага Саюза Віктара Васільевіча Еўдакімава, Віктара Рыгоравіча Жолудзева і палкоўніка Сяргея Апанасавіча Мядзведзева, астанкі якіх перапахаваны сюды ў 1986 г., пастаўлены гранітныя бюсты.



## Брацкая магіла савецкіх ваеннапалонных і савецкіх воінаў на вуліцы Мядзведзева



Растуць у скверыку таполі,
Яны растуць у два рады.
Не зарасце травой ніколі
Сцяжынка, што вядзе сюды.
Ляжыць там брацкая магіла
Салдат Айчыннае вайны,
Іх смерць заўчасна пакасіла,
І вечным сном там спяць яны.

У 1941-1943 гадах у Ваўкавыску знаходзіўся шталаг №316 (лагер для ваеннапалонных радавога і сяржанцкага састава). Ваеннапалонныя размясціліся ў былых канюшнях польскага палка. Зіма 1941-1942 гадоў аказалася пагібельнай для ўсіх савецкіх ваеннапалонных. Вясной 1942 года з 3,8 мільёнаў ужывых засталося не больш за 1,2 мільёна чалавек. Не быў выключэннем і ваўкавыскі лагер, але дакладная лічба памерлых тут невядома. Вядома, што ў пачатку лютага 1942 года тут знаходзілася 5414 савецкіх ваеннапалонных, а праз два месяцы іх засталося толькі 2087 чалавек. Кожны ранак палонныя чырвонаармейцы на вазах звозілі сваіх памерлых таварышаў.

Па ўліковых звестках тут пахавана 4488 чалавек (4302 ваеннапалонныя і 179 савецкіх воінаў, якія загінулі пры вызваленні Ваўкавыска і Ваўкавыскага раёна). З іх вядомыя імёны 435. Невядомыя – 4053. Да 1 ліпеня 1942 года ў шталагу засталося 849 чалавек , і яго ліквідавалі.Тых, хто выжыў, перавезлі ў шталаг горада Беластока. За час існавання лагера ў Ваўка-выску тут загінула каля 20 тысяч чалавек.

У 1950 г. на магіле вязняў пастаўлены абеліск. Напярэдадні 70-годдзя Перамогі на брацкай магіле ўстаноўлены памятны знак.

## Магілы ахвяр фашызму ва ўрочышчы Парахаўня



За 1 км на поўдзень ад горада, ва ўрочышчы Парахаўня ў шасці магілах пахаваны больш за 4 тыс. жыхароў, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікую Айчынную вайну, а таксама перапахаваны астанкі 146 загінуўшых воінаў і мірных жыхароў, якія былі знойдзены пад час правядзення пошукавых работ. У 1965 г. пастаўлены помнік – скульптура воіна і партызана.

На ўскраі Ваўкавыска
Ёсць невялікі лес.
Стаяць тут абеліскі
І шэпча казкі бэз.

У дні, калі прыкладам
Паны свой рэй вялі,
Парахавыя склады
Тут, у бары, былі.

## Цяжкі танк ІС-3

6 верасня 2013 года, напярэдадні Дня танкістаў, у Ваўкавыску адкрыты манумент у гонар тых, хто ў 41-м - абараняў межы горада, у 44-м - вызваляў, - танк на пастаменце. Сімвалам памяці аб абаронцах стаў лепшы цяжкі танк свайго часу ІС-3. Ён не паспеў прыняць удзелу ў Вялікай Айчыннай вайне. Але гістарычным фактам застанецца менавіта тое, што распрацаваны ў гады Вялікай Айчыннай вайны, гэты танк да канца 50-х гадоў захоўваў за собой лепшыя для цяжкай машыны баявыя якасці.



## Мемарыяльны комплекс “Шавулічы”




**З 9200 спаленых і знішчаных фашыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны беларускіх вёсак 627 спалены разам з жыхарамі.У Гродзенскай вобласці карныя аперацыі праведзены ў 24 вёсках, у тым ліку ў вёсцы Шавулічы.**

Кожны год 7 ліпеня званы набатам напамінаюць аб трагедыі, што адбылася тут у 1943 годзе. Да вайны гэта была заможная вёска, дзе жылі добрыя, працалюбівыя людзі. Зараз ад яе захаваўся толькі брук, якім некалі была вымашчана цэнтральная вуліца, і фундамент каменнай школы. Замест дамоў — дзве брацкія магілы ні ў чым непавінных ахвяр і абеліск з імёнамі загінуўшых. Нямецкія салдаты і паліцаі пакаралі жыхароў вёскі за дапамогу партызанам. Раніцаю акупанты акружылі вёску, выгналі ўсіх сяльчан з хат і сагналі ў цэнтр вёскі. Адных прымушалі рыць глыбокі роў, а другіх зачынілі ў хлявах. А пасля расстралялі ўсіх, у тым ліку жыхароў навакольных хутароў: 366 чалавек, у тым ліку 120 дзяцей. Усе пабудовы ў вёсцы і на хутарах спалілі. Пасля вайны Шавулічы не адрадзіліся. Доўгі час на месцы знішчанай вёскі заставаліся толькі падмуркі згарэлых хат. У 2013 годзе да 70-годдзя трагедыі быў пабудаваны мемарыяльны комплекс, пасаджана Алея памяці. Ініцыятарам выступілі прафсаюзы Гродзенскай вобласці. Былі ўстаноўлены імёны ўсіх загінуўшых жыхароў, і зараз на месцы кожнага згарэлага дома пабудаваны сімвалічныя сцены з імяннымі таблічкамі.

***Над выпуском работали:***
**М.Н.Рудяк, Е.Л. Ленец**
***Наш адрес:***
**231900 Гродненская обл.,**
**г. Волковыск, ул. Победы, д.52**

***Контактные телефоны:***
приемная комиссия - (8-01512) 5-11-87
директор - (8-01512) 9-77-04
факс - (8-01512) 9-77-04

**Электронная почта:** vgak@vgak.by